
Пятро Прыходзька
ВІШНЁВЫ АГОНЬ



Бел1с
П85

Пятро Прыходзька

# Вішнёвы агонь

ВЕРШЫ І ПАЭМА

ХОТИ... РАЙОН... БИБЛИОТЕКА

Дзяржаўнае выдавецтва БССР
Мінск · 1963

## КАЛІ Я НАРАДЗІЎСЯ...

Я на свет нарадзіўся ў дваццатым,
Калі бацька акопы капаў.
Бліскавіцы трымцелі над хатай,
Гром гарматны калыску гушкаў.

Адбівала атакі краіна,
Пасылаючы ў бітвы байцоў.
Ля дарог, нібы гронкі каліны,
На траве запяклася іх кроў.

І, быць можа, тады ў дальнім краі,
Там, дзе бацька мой быў на вайне,
Чарнакрылая бурка Чапая
Засланіла ад смерці мяне.

*1961 г.*

# ВІШНЁВЫ АГОНЬ

## ВІШНЁВЫ АГОНЬ

*Паэма*

### 1

Бялеюць хаты ў ціхіх вёсках,
Сады мяцеляцца наўкол,
І ціха падаюць пялёсткі,
Нібы гусіны пух, на дол.

Віецца сонечнай раўнінай
Бальшак — разблытаны клубок.
Ля вокан кожнае хаціны
Гарыць вішнёвы аганёк.

Валынь! Ты ўся — як май зялёны,
Як сад абуджаны ад сну.
Адсюль на поўнач у вагонах
Вязуць з букетамі вясну.

А за вясною ўслед паслала
Ты вугаль свой туды і сталь.
Ад працы аж пацеюць шпалы,
Груз несучы цяжкі ўдаль.

Зямля мне родная! Цябе я
Не раз прыгадваў, як вясной
Ты праз вішнёвую завею
Вяла мяне ў суровы бой.

Цяпер блакнот са мною толькі,
Ў якім старонкі многіх год.
Узяў салдат замест вінтоўкі
Дубец ракітавы ў паход.

Іду пад вартай тапалінай
Былой дарогай франтавой.
Аддаўшы цвет раям пчаліным,
Шапочуць вішні над ракой.

Нібы адной ад сонца хусткай
Усе укрыліся яны.
Ну вось і вёска тая хутка,
Дзе я не быў яшчэ з вайны.

Туды мяне зноў кліча сэрца,
Там асыпаў пялёсткі сад.
Стубелка ціхая ліецца,
Як і семнаццаць год назад.

Тут, дзе вішнёвыя мяцелі
Усцілалі шлях салдацкі мой,
Сягоння зноў плады даспелі,
Набракшы чырванню густой.

Дзе ж вішанька пры аканіцы,
Што пасадзіў калісь я сам?
Прыйшоў ад сэрца пакланіцца
Табе, Валынь, тваім садам.

Міналі дні. Але не гас ён
Нідзе, агонь вішнёвы той.
Дзе б ні хадзіў, ён зоркай яснай
Свяціўся ўсюды прада мной.

Маёй вясной, вясною вечнай
Гарыць ён у цішы далін
І пра далёкія сустрэчы
У сэрцы будзіць успамін.

Калі б сустрэліся звычайна —
Забыўся б хуценька аб ёй,
Ды от жа позірк з нейкай тайнай
І шчырай-шчырай цеплынёй.

Стаяў, ад дыму ўвесь счарнелы,
Ссыпаўся з плеч акопны жвір.
А прада мной — дзяўчына ў белым,
З вачмі глыбокімі, як вір.

Мне не забыць вачэй тых чорных:
Бо зоры ўспыхнулі ў начах
І ўся краса Валыні зорнай
Тады адбілася ў вачах.

Хто б іншы, можа, не прыкмеціў
Жывой іскрынкі тых вачэй,
А мне здалося: сонца ў квецень
Праменні кінула ярчэй.

Мне б гаварыць бясконца з ёю,
А я, разгублены, маўчу.

Прайшло па сэрцы штось такое,
Што толькі я адзін адчуў.

Не, я не зваў яе каханай,
На гэта права я не меў,
Ды сад вішнёвы ў гэты ранак
Бялей, здаецца, закіпеў.

Сярод вясенніх кветак пышных,
Не сцятых лютаю вайной,
Яна мне бачылася вішняй
Бялюткай, першаю, маёй.

Быў я шчаслівы разам з ёю
Ісці да плёса раніцой,
Схіліцца ціха над вадою,
Сябе пабачыць побач з ёй.

Мне доўга-доўга будзе сніцца
Юнацтва явай даўніх мар,
Як піў ваду з тае крыніцы,
Дзе люстраваўся любы твар.

Як ласку першае спякоты,
Адчуў цяпло яе рукі.
О, ранец мой, шынель пяхотны,
Я вас праслаўлю на вякі.

Яна з такой усмешкай мілай
На вас глядзела...
Быў я рад,
Як гузік раніцай прышыла,
Сказала:
«Ў добры шлях, салдат!»

«У добры шлях!» — акопны вецер
Шумеў, атросшы росы з траў.
І я, найшчаслівейшы ў свеце,
Тады яе пацалаваў.

Як сведка нашага спаткання
Стаяла вішня пад акном.
Той дзень маім быў самым раннім
І, можа, самым познім днём.

Хоць гаварыў з ёй гэтак мала,
Але затрапятаў душой,



Калі на ростані сказала:
«Жадаю шчасця, голуб мой!»

«Жадаем шчасця!» — паўтаралі
Расой умытыя сады.
Пялёсткі белыя апалі
Ад грукату на шкло вады.

І я ўжо там, дзе міны рвуцца,
Дзе бой вядуць сябры мае.
А як хацелася вярнуцца,
Адчуць цяпло рукі яе!

Не, не абняць, а толькі глянуць,
Прайсці з ёй сцежкаю праз сад.
Ды грымнуў голас капітана:
— Хутчэй!
Чаго адстаў, салдат?

Адстаў? О не, сябры, прабачце.
Я толькі трохі сцішыў крок:
Яшчэ раз любую пабачыць
Хацеў з пагорачка, здалёк.

Ды ўжо знікае за пагоркам
У вішнях мазанка яе.
Насустрач вецер дымам горкім
І пылам твар мой абдае.

Вось і разыдуцца дарогі,
У стэпе згубяцца сляды.
Вайной было сумоты многа,
А тут — трывога назаўжды...

Я набіваю моўчкі дыскі,
Рыхтую к бою кулямёт.
Валынь! Якою роднай, блізкай
Ты сталася ў далёкі год!

І вёска з мілай назвай — Радуй,
І сад, дзе вішні зацвілі!
Ужо выходзілі брыгады
За намі следам на палі.

Заворвалі акоп той самы,
Ў якім ляжаў я над ракой.
Яе зямля з яе садамі
Мне стала блізкаю, маёй.

І домік той, і вішня тая,
Дзе не сціхае бас чмяля...
Я ведаць не хацеў, якая
Яшчэ сустрэнецца зямля.

Тут зведаць шчасце мне і гора —
Усё, усё, што лёс паслаў.
Ды чую, хтось нібы гаворыць:
«Ты што, салдат, засумаваў?»

Ісці нам праз лясы, даліны,
Яшчэ капаць акопаў шмат.
Ты не адну яшчэ краіну
Павінен вызваліць, салдат!

Над шляхам росным пошум вецця,
Дубы, як воіны ў страі.
Табе — далей ісці па свеце
Праз ночы, завеі, баі.

Калі ты стаў ёй другам, братам,
Дык будзе жыць любоў твая!
І я пайшоў з валынскай хаты
Туды, дзе іншая зямля.





ХОТ...СКАЯ
РАЙОННАЯ
БИБЛИОТЕКА

3

Даруй, чытач, што успаміны
Пра дні мінулыя вяду.
Не зараслі яшчэ сцяжыны,
Якімі зараз я іду.

А мо насустрач мне дарогай
Хтось выйдзе з вёскі на ускрай.
На сэрца зноў лягла трывога,
Гаворыць сэрца: «Пачакай.

Каго, вандруючы, шукаеш?
Ты не турбуй былых сяброў.
Будзь рады тым, што маладая
Тут нарадзілася любоў.

Што не скасіла гора-ліха
Тваю салдацкую вясну,
Што ты адным паветрам дыхаў
І зорку бачыў з ёй адну.

А хто ж яна?
Яе тут, можа,
Даўно няма ўжо... Ну, а ты
Ідзі далей...»
На прыдарожжы
Шумяць вішнёвыя сады.

«Ідзі! Ты й тут не будзеш лішні,
Цябе, як друга, стрэнуць тут,
У вёсцы Радуй.»

Хаты.
Вішні.
Стары асвер.
Знаёмы кут!

І вішанька мая ля хаты
Ўжо адцвіла семнаццаць раз...
Які прыгожы і багаты
Стаў любы край за гэты час!

У спелай чырвані раўніна,
Ранеты сыплюцца на брук...
— Скажыце, тут жыве дзяўчына?..
Яна...
— Як прозвішча?

— Цішчук.
— О, Цішчукоў у нас замнога.
Дзяўчат — амаль што паўсяла...
— Мне Кацярыну...—
І трывога
Ізноў у сэрцы ажыла.

Уважна слухае мужчына.
Яму тлумачу. Ўсё дарма.
Ён кінуў позірк:
— Кацярына?
Такой, здаецца, ў нас няма.

— Няма?
Ну што ж, тады бывайце!..
Назад павольна я іду.
Як паратунак:
— Пачакайце!..—
Крычыць мне цётка на хаду.—

Вам фельчарыцу, пэўна, Кацю,
Што ўчора з вобласці да нас?
Медпункт цяпер у той вунь хаце,
Хадземце. Я туды якраз.

Медпункт? Які? Не разумею...
Не меў знаёмых фельчароў.
А мо?.. Вішнёвая завея
Мне прыгадалася ізноў.

Сады кіпелі ў кветках пышных,
Не сцятых лютаю вайной.
Яна мне бачылася вішняй
Бялюткай, першаю, маёй.

Пыліцца вузкая дарога,
А мы ідзём на ўскрай сяла.
— У нас дзяўчат прыгожых многа,—
Дарогай цётка пачала.

Гаворыць цётка мне, як маці,
Пра ўсё — пра дом свой, пра сям'ю...
Я запытаць хачу: «А Кацю,
Вы Кацю ведалі маю?»

Хачу прызнацца, што не раз я
Сюды за марамі ішоў,
Ды цётка, глянуўшы, адразу
Ўсё зразумела і без слоў...

4

Ад сэрца дзякуй, цётка Лушка,
За ўсё, што дружба нам дае:
За чай гарачы,
За галушкі,
За словы шчырыя твае.

— Вось будзе Каця госцю рада!
Вы, знаю, ведалі яе...—
І цётка хітрая з шуфляды
Мне фотакартку дастае.

Гляджу — знаёмы твар дзяўчыны...
І хлопчык... хлопчык на руках...
— Дык гэта ж Каця! Кацярына!
Дачка Рыгора Цішчука!

А вы сваёй дачкою звалі?
— Яна радней другой дачкі...
І цётка выйшла з хаты,
Удалеч
Глядзіць трывожна з-пад рукі.

А за акном маленькай хаты
Раскінуўся валынскі край.
Тут без мяне садок багаты
Адсвяткаваў свой пышны май.

Даспелі вішні на галінах.
У сэрцы верш ужо даспеў.
Дзе ты сягоння, Кацярына,
Чаму цябе я не сустрэў?

Напэўна, я спазніўся.
Недзе
Цяпер, вячэрняю парой,
З брыгады у брыгаду едзеш
Дарогай ціхай, палявой.

Цябе ўжо хтосьці, Кацярына,
Любімай жонкаю назваў...
І фотакартку — маці з сынам —
Я з горыччу ў альбом паклаў.

Я не магу чакаць, мне сёння
Патрэбна ў Роўна быць ізноў.

І я, забыўшыся ў бяссонні,
Пішу ёй некалькі радкоў:
«Дарога выпала такая —
Наведаў я валынскі край,
Да новай стрэчы, дарагая!
Твой сябра, твой салдат...
Бывай!»

Смех моладзі ля вокан льецца.
Шуміць вячэрняе сяло.
А цётка ўсё спытаць імкнецца:
— Чаму вас доўга не было?

Былі б мы рады вашай вестцы.—
І са смяшынкай на хаду:
— Даўно на Каціным бы месцы
Знайшла каму насіць ваду...

— Ваду?
— А што ж!
— Напэўна, ў Каці
Ёсць муж?
— Няма...

«А чый жа сын? —
Блукае мой пагляд па хаце.—
Чаму ён з цёткаю адзін?»
Цікаўны, поплеч стаў на ўслоне,
Пагоны гладзіць — дзе той страх?

О, як бы я хацеў сягоння
Сябе пазнаць ў яго вачах,
Брысці з ім сцежкаю рыбацкай
Да плёса, дзе стаяць чаўны.
Няхай бы думаў ён, што бацька,
Хоць позна,
А прыйшоў з вайны.

Але навошта мне трывожыць
Яго маленства?
Я тут госць.
Хай сын не ведае, бо можа
Ў яго і лепшы бацька ёсць.

Я тым шчаслівы, што ад сэрца
Сваю матулю ён хваліў.
Дабранач вам, пайду да дрэўца,
Якое колісь пасадзіў.

5

Мне жыць не толькі успамінам
Аб тых трывожных доўгіх днях.
Цябе б мне сёння, Кацярына,
Сваёю жонкаю назваць.

Ізноў бы ў вочы заглядзецца,
Якія сніліся не раз.
Ды сэрца штосьці трывожна б'ецца.
А ты сустрэчы з ёю рад?

Кінь, сэрца!
Гэта ўсё не тое...
Ты ж добра ведаеш само,
Што марыў я спаткацца з ёю
Вясной, ці летам, ці зімой,
Што не забудзеш ты давеку
Таго, каму цябе аддаў,
Што жыць не варта чалавеку,
Які ўсім сэрцам не кахаў.

Не, я не буду прызнавацца
Ў пачуццях, шчырасці сваёй.



Навошта сёння сустракацца
Мне з ёй, быць можа, ўжо чужой?..

Хай без мяне ў валынскім краі,
Як і жыла, жыве сям'я,
Квітнее вішня маладая.
О вішня першая мая!

Мне доўга-доўга будзе сніцца
Юнацтва явай даўніх мар,
Як піў ваду з тае крыніцы,
Дзе люстраваўся мілы твар.

Што ж, многа стрэч, раптоўных, розных...
Было каханне — і няма...
Хлусіць сабе самому?
Позна.
Яна...
Няўжо?
Яна сама!

Стаіць ля веснічак, нясмела
Глядзіць. Мяне не пазнае.

Такі ж, як быў, твар белы-белы
І вочы чорныя ў яе.

Глядзіць — успомніла, здаецца:
Сорак чацвёрты... Над вадой
Два побач твары...
Б'ецца сэрца:
«Жадаю шчасця, голуб мой!»

І ўсё...
Знямелі мы. Ні слова...
Паплыў у дыме зорны свет...
Ды Лушка ўжо на стол дубовы
Кваціcты кінула сурвэт.

Прыйшлі суседзі — заспявалі
Пра гай зялёны і густы...
Нам расхінула песня далеч,
Па сцежках павяла ў жыты.

Яна расказвала нібыта
Пра ўсё, што мы перажылі,
Сяброў губляючы у бітвах
Далёка на чужой зямлі.

Як мы чакалі іх гадамі
Адтуль, дзе лютая зіма,
Хоць ведалі пра тое самі,
Што іх віны ні ў чым няма.

Пра што яшчэ?
Пра ўзлёт у неба,
Што ўскалыхнуў усё сяло?
Пра пацалункі?
Не. Не трэба.
Тут пацалункаў не было.

Была гасцямі поўна хата.
Гарэлі зоры над садком.
Здалося мне, я зноў салдатам
Зайшоў у гэты шчыры дом.

Зайшоў — трывожная дарога!
Начлег кароткі перабыць.
Як і раней, каля парога
Вядро на ўслоніку стаіць.

Як і раней, старая маці
Мяне частуе малаком,

І хлопчык бегае па хаце
З драўлянай шабляй
Сугрунём...

Было-сплыло. Другая хата,
Ў якую завітаў здалёк.
Заместа Кацінага брата
Цяпер бяжыць яе сынок.

З драўлянай шабляю...
Запелі
Суседзі песню пра цябе,
Як вішні-вочы пачарнелі,
Кагось чакаючы ў журбе.

Ты не змянілася ніколькі,
Усё такая ж, як была.
Прыгожы хлопчык сын твой Колька,
Усё яму ты аддала:

Свой смех, брыва размах крылаты
І спрыт, што ўбачаць на касьбе.
Красы так многа аддала ты,
Яшчэ й пакінула сабе.

6

Заняўся ранак,
Людзі ў поле
Ідуць на працу грамадой.
Час развітацца з шустрым Колем
І з цёткай Лушкай.
І з табой.

Маўчы, не трэба, Кацярына,
Аб тым, як ты жыла адна...
Адна, самотная дзяўчына,
А тут яшчэ яна,
Вайна.

Цябе, як белы той пялёстак,
Сарваў хтось, можа, незнарок.
Хацеў назад вярнуцца ў вёску,
Але не змог прыйсці здалёк.

З чужых краёў, дзе быў я ранен,
Не мог прысланць табе лістоў.
Жыў буду, думаў, веснім раннем
К табе дастануся дамоў.

Былі мае цяжкія раны,
Ї не спаткаўся я з табой.
Пісаў я ліст табе, каханай,
З-пад Віслы лютаю зімой.

Не дакаціўся голас рэхам.
На ліст адказу не было.
Праз год мне выпала заехаць
Вясною ў тваё сяло.

Тады займаўся сумна ранак.
Нікога ў хаце.
Цемра, ціш...
І на акне прыцвікаваны
Дзве дошкі — як магільны крыж.

Сказалі мне, што ў гэтай хаце
Было заліта ўсё крывёй,
Забіты брацік, бацька, маці
Ўначы бэндэраўскай рукой.

А ты? Дзе ты? Пытаўся ў сведак
Бяды.
Ніхто не адказаў.

У абласным бюро даведак
Ніхто мне адрасу не даў.

Нібы вішнёвая завея
Пазамяла твае сляды.
Але жыла, жыла надзея,
Што прыйдзеш, вернешся сюды.

І нам — я верыў — давядзецца
Сустрэцца новаю вясной.
Я пасадзіў на ростань дрэўца
Тут, побач з вішняю тваёй.

Каб гэта дрэўца расквітнела,
Вясною ўзяўшы з неба сінь,
Каб яшчэ больш папрыгажэла
Твая зямля — твая Валынь.

Другой вясной у веі мая
Адсюль я зноў ішоў адзін...
Цяпер сядзіш ты, вышываеш
Камусьці вёсны на ўспамін.

Даруй, даруй — аб ім не буду.
Напэўна, добры чалавек.

Калі ты хочаш — я забуду
Сустрэчу нашую навек.

І не адважуся ніколі
Табе аб ёй нагадваць больш,
Хайаднаму мне сэрца коле,
Я пагашу ў душы свой боль.

Шмат год шчаслівых і суровых
Прайшло рупліваю хадой,
А мне ўсё сняцца, сняцца словы:
«Жадаю шчасця, голуб мой!»

Бяда была б тады бядою,
Калі б жыла зусім адна,
Калі б лічылі удавою
З тых дзён, як скончана вайна.

А ты? Чаго ж цяпер нясмела
Мне хочаш шчасця пажадаць?
Кінь, не тужы: што адляцела —
Ужо таго не прычакаць.

Жыццё хай будзе шчасцем поўна!
Камусьці, можа, і няўцям,

Што сон адзін сягоння ў поўнач,
Як і раней, прысніўся нам.

7

Вішнёвы край!
На гэты вечар
Няхай не ляжа цень журбы.
Бываюць ростані, сустрэчы,
Якіх ніколі не забыць:

Адны — азначаныя смуткам,
Другія — радасці слязой.
Але не вымавіш ціхутка —
Кахаеш ці забыў душой.

Я не хачу шукаць прычыны
Самотнай ростані навек.
Ты мне ўсё тая ж, Кацярына,
Якой была. Ты — чалавек.

Што больш сказаць табе? Не знаю.
Магчыма, гэта ўсё дарма.

Прызнацца, што цябе кахаю?
Навошта? Ведаеш сама.

Мы пойдзем лепш туды, за вёску,
Дзе маці, брацік, бацька твой.
Там ноччу белыя пялёсткі
Былі паліты іх крывёй.

Мы аддадзім паклон ім нізкі,
І над магілай мірным днём
Мы ім узнімем абеліскі,
А іх забойцаў праклянём.

Семнаццаць год назад, у маі,
Я тут развітваўся з табой.
А сёння полымем палае
Агонь вішнёвы над зямлёй.

У спелых ягадах галіны.
Звініць крыніца серабром.
Уся валынская раўніна
Гарыць вішнёвым тым агнём.

І да апошняга дыхання
Я пранясу яго з сабой,

Не гасне першае каханне,
Што стала радасцю й журбой.

Патрэбна мець у сэрцы мужнасць
І жыць, як не было там, жыць.
Жыццё вучыла вернай дружбай,
Як лепшай песняй, даражыць.

Цяпер, калі ўсю ноч на золку
Пішу я гэтыя радкі,
Хачу, каб ты адчула зноўку
У іх цяпло маёй рукі.

Ляці, мой ліст, ляці па свеце.
Каханне ёсць. І песня ёсць.
Хацеў бы я, каб нашы дзеці
Прайшлі праз нашу маладосць,

Каб вечныя прызнанняў словы
Заўсёды чыстыя былі,
Каб і для іх агонь вішнёвы
Свяціўся шчасцем на зямлі.

Хай даспявае больш на полі
Для іх калоссяў залатых

І не паўторыцца ніколі
Расстанне нашае для іх.

Хай цэлы свет, а не палова,
Збярэцца ў шумны гурт сяброў
І людзі ўсе на розных мовах
Уславяць дружбу і любоў.

Бывай!
Расой іскрыцца вечар.
Над рэчкай сіні сад заціх.
Не, не бывай, а да сустрэчы,
Да новай радасці ў жыцці.

І дзякуй, родная, што ў вецер
Жывы агеньчык зберагла,
За тое, што з усіх на свеце
Ты самай блізкай мне была.

...Даспеў, гарыць агонь вішнёвы.
Іду сцяжынкай лугавой,
А ўслед ляцяць, лунаюць словы:
«Жадаю шчасця, голуб мой!»

*1962 г.*

*

Мо хто-небудзь мяне папракае,
Што я шмат пра юнацтва пішу?
Адкажу:
Песні роднага краю
З дзён юнацкіх я ў сэрцы нашу.

І калі ўжо глыбокая восень
Замяце на дарогах сляды,
Буду славіць сваю маладосць я,
Буду песні складаць ёй заўжды.

Буду ўдзячны за ўсё: што імкліва
Праз усе перашкоды вяла,
Што ў каханні была сарамлівай,
А ў паходах — адважнай была.

*1961 г.*

## АРЭШЫНА

Звонка вокліч раздаецца.
Даганяем рэха мы.
Жнівень стукае па сцежцы
Спелымі арэхамі.

Будзь сягоння, дарагая,
Светлым днём уцешана.
Паміж дрэў з табой шукаем
Гнуткую арэшыну.

За дубком, нібы дзяўчына,
Вунь яна хаваецца.
Шмат арэхаў на галінах
Лісцем укрываецца.

Залацяцца светлым ранкам,
Поўныя і спелыя.
Не спалілі іх маланкі
І грамы вясеннія.

Ты ірві іх, як умееш,
Хоць з пустымі змешаны.
Не шкадуй, што апусцее
Гнуткая арэшына.

Хай арэхі, што збіраем,
Кошыкамі ўзважацца.
Будзе зноў вясна над краем,
Песня зноў завяжацца.

*25.VIII 1962 г.*

*

Чарэмха ў садзе адцвітала
Маёй дваццатаю вясной.
Пялёсткі, нібы снег падталы,
Услалі луг па-над ракой.

Ішоў к табе я на сустрэчу
Святочны, шчасны, малады.
Ды над чарэмхаю ў той вечар
Узняўся клубам горкі дым.

І мы з табою разышліся
На сцежках роднае зямлі.
Чакаў тваіх на фронце пісем,
Яны ж чамусьці не дайшлі.

Ці не знайшлі таго акопа,
Дзе я ляжаў пад злым агнём,
Ці то Заходняя Еўропа
Ім шлях закрыла ў родны дом.

У садзе зноў цвіце чарэмха,
Пялёсткі сцеле на зямлю.
О, калі б мне данесла рэха
Тваё пяшчотнае: «Люблю...»

*1961 г.*

## СЯБРОЎСКАЕ СЛОВА

*Анатолю Астрэйку*

Калі славутым юбілеем
Засерабрыцца галава,
Не буду я табе ялею
Ў сваю прамову падліваць.

Скажу адно: ты быў вясёлы
І самы шчыры між сяброў.
У дні вайны твой мужны голас
К нам з тылу ворага ішоў.

Праз цемру, дым сваёй сцяжынкай
Ты верным воінам хадзіў,
Заўжды апошнюю скарынку
З сябрамі напалам дзяліў.

Дай абдыму цябе за мужнасць,
За шчырасць, што ў душы збярог,
Яшчэ за тое, любы дружа,
Што ты інакшым быць не мог.

*1961 г.*



## БАЛАДА ПРА НЕВЯДОМАГА

Аднойчы да Буга шматлікім атрадам
Прыйшлі мы. І там
Разбітыя камні вось гэту баладу
Паведалі нам.

На камені тым, што счарнеў у байніцы,
Чытаў наш атрад:
«Да самае смерці стаяць на граніцы!
Ні кроку назад!»

Хто гэтыя словы пад месяцам белым
Накрэсліў штыком?
Я знаю, ён быў пагранічнікам смелым,
Адважным байцом.

Напэўна, аб першым спатканні ён марыў,
Аб родных, сябрах.
І першым прыняў на сябе ён удары
У цяжкіх баях.

Не пядзю зямлі ён адстойваў — паўсвета,
Ўсю маці-зямлю,

Хоць мо не паспеў шчэ нікому тым летам
Прамовіць «люблю».

Казалі, нібыта пад танкамі жвірам
Засыпан салдат.
А ў крэпасці потым аб ім камандзіры
Аддалі загад:

«Байца-пагранічніка — к званню героя!
Загад — у Маскву!»
Але не дазнаўся ніхто той парою,
Як хлопца завуць.

Ніхто тады з Брэста ў Маскву не даставіў
Загаду таго.
Ніхто не пачуў пра салдата, пра славу,
Пра подзвіг яго.

Сказалі — загінуў, і нават дадому
Ліста не паслаў.
І хтось на магілцы яго «Невядомы»
Пасля напісаў.

Лічылі — аддаў ён спякотнаму лету
Усю сваю кроў.



А сёння ґавораць, нібы з таго свету
Вярнуўся дамоў.

Магчыма, дзе-небудзь па роднай старонцы
Ён доўга тужыў
І нават аб тым не сказаў, што у бойцы
Танк першым падбіў.

Ці ж вінна зямля, што нічога не знала
Пра сына свайго?
Сягоння яна нам сама расказала
Пра подзвіг яго.

Не позна яшчэ — хай падпіша Радзіма
Той першы загад.
Салдата ж за бацьку, за маці абдыме
Увесь наш атрад.

Няхай адсвяткуюць зварот яго дома
Шчаслівай сям'ёй.
А мы на граніце замест «Невядомы»
Напішам — «ГЕРОЙ»!

*Снежань 1962 г.*

## БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ

Давялося мне ў час падарожжа
Затрымацца ў вёсцы адной.
Не багаццем так дом устрывожыў,
Як сардэчнасцю, ласкай сваёй.

Як прыемна, што гэткія ў свеце
Людзі ёсць чалавечныя, шчырыя.
Вось да маці вярнуліся дзеці,
Нібы птушкі з далёкага выраю.

І шчабечуць, да ночы гавораць
Пра бязмежныя родныя далі
І пра тое, што зведалі гора,
Калі толькі яшчэ падрасталі.

Як вадзіла іх маці у поле,
Дзе вясною звяно яе поле.
Даглядаць сад калгасны хадзілі,
Каб антонаўкі добра ўрадзілі.

Сын старэйшы расказваць мне мусіць,
Што і ён мае клопату многа
Разам з маці.
Ды толькі чамусьці
Не гаворыць пра бацьку нічога.

Аглядаю вясковую хату:
Ўся сцяна
Фотакарткамі ўстаўлена.
Вось яшчэ сын у форме салдата,
Што ў вялікім паходзе праслаўлены.

Ў яго мужным паглядзе салдацкім
Ўсмешку воч сваіх маці пазнала.
Я не буду распытваць,
Хто бацька
Тых дзяцей,
Што яна ўзгадавала.

*1961 г.*

## ЛАСТАЎКА

Адлятала ты ў вырай далёкі,
Крыллем вострым разрэзаўшы ціш.
А сягоння ізноў буслаў клёкат
Абвясціў мне, што ты прыляціш.

Іхнім следам з далёкай краіны
Ты вяртаешся зноўку дамоў.
Расчыняю я вокны хаціны,
Каб адчуць подых весніх вятроў.

Каб убачыць цябе над прасторам,
Дзе шырокіх палеткаў разбег.
А ты ўсё не ляціш!
Што ж за морам
Затрымала там сёння цябе?

Мо над Афрыкай полымя бітвы
Засланіла дарогу тваю,
Як з краіны,
Крывёю залітай,
На Радзіму ляцела сваю?

Але ўсё ж там, дзе неба чужое,
Ты, напэўна, згадала свой дом,
Як у цёплым гняздзе пад страхою
Ты маленькім расла птушанём.

*1961 г.*

## НЕ СПІЦЦА НАЧАМІ...

Вы, доктар, пытаеце, як я сябе адчуваю,
Ці добра мне спіцца начамі?
Ну што адказаць? Далі-бог жа, не знаю.
Вы ўсё лепей бачыце самі.

Вось вы мне жадаеце, доктар, спакою,
Снатворнае мне прапануеце.
А як жа заснуць мне,
Калі над зямлёю
Так хораша птушкі спяваюць?
Вы чуеце?

Ўсміхнуліся, доктар?
Я вас разумею:
«Днём слухайце голас птушыны».
Не.
Дзень запаўняюць другія падзеі,
Якімі жыве ўся Айчына.

У кожнага з нас ёсць свае абавязкі,
Свая, хоць малая, а ўсё ж такі — праца.



І крыўдна бывае тады,
Як няма з кім
Аб самым галоўным ў жыцці паспрачацца.

Бывае —
Ўвесь дзень з землякамі на полі.
Ўсё трэба узважыць
Да кожнай драбніцы.
А тут абібок якісь гэтак насоліць,
Што потым да самага ранку не спіцца.

Вось ён!
Шмат каму насаліў за паўвека,
А зараз і сам на прыём к вам спяшаецца.
Ўсе лекі скупіў у сталічных аптэках.
Аб чым гаварыць з ім?
Аб чым з ім параіцца?

Яму пажадайце вы, доктар, спакою,
Снатворнага дайце —
Няхай сабе лечыцца.
А мне...
Я паўночнаю гэтай парою
Паслухаю песню лірычную з Рэчыцы.

То людзі пяюць пра любоў маладую,
Пра месяц, пра зоры, дарогі жыцця...
Колькі ў той песні,
Што з вамі мы чуем,
Радасці, думак і пачуцця!

Ціха гамоніць з галінкамі вецер,
На лузе туман дываны пасцяліў.
Напэўна, сядзяць закаханыя дзесьці
І вершы чытаюць аб роднай зямлі.

А там, над зямлёю, дзе ясныя зоркі,
Хтось крылы у новы палёт распасцёр...
Як жа мне, доктар, заснуць,
Калі столькі
Уражанняў, думак прыносіць жыццё!

*31.VIII 1962 г.*



## САПРАЎДНЫ ДРУГ

Ён не сказаў табе адразу,
Што ты яму за ўсіх бліжэй,
Што ён гатоў з табою разам
Ісці праз дым і змрок начэй.

Ён не пакляўся ў дружбе вечнай,
Калі ў шляху цябе спаткаў,
А толькі ўсмешкаю сардэчнай
Табе на ўсмешку адказаў.

А толькі ў дождж пад цёмным небам
Табе шалаш свой уступіў
І напалам кавалак хлеба
З табой па-брацку падзяліў.

*31.VIII 1962 г.*

## КАЛІ САДЗЯЦЬ САДЫ...

Калі садзяць сады,
вецер лісце мяце
І на сцежках сляды засыпае.
А мне мроіцца зноў,
як у весняй красе
Май разносіць пялёсткі па краі.

І хоць зараз шуміць
у лясах лістапад,
Жураўлі адлятаюць у вырай,
Я ўжо бачу: кіпіць
белай квецені сад
На бязмежнай прывольнае шыры.

Тыя дрэўцы,
Што сёння пасаджаны мной,
Разрастуцца шырока радамі,
Рой пчаліны
гасцінна сустрэнуць вясной,
А увосень —
Адорацць пладамі.

Хай на радасць Радзіме сады па вясне
Белым пухам сцяжынкі усцелюць,
Разальецца пад сонцам па ўсёй старане
Колер майскіх чырвоных мяцеліц.

Рэвалюцыя наша ўсім нам назаўжды
Азарыла да сонца дарогу.
Не дарма ж мы
ў кастрычніку садзім сады,
Каб расці ім для шчасця людскога.

*Жнівень 1962 г.*

# Зоры спяваюць

## ЗОРЫ СПЯВАЮЦЬ

Нехта з даўняга часу прарочыў,
І хадзіла легенда такая,
Быццам летняю сіняю ноччу
Зоры ў небе спяваюць.

Я ў легенду, прызнацца, не верыў.
Вечарамі на ціхім узлессі
Паглядаў я на зорку Венеру
І не чуў аніякае песні.

Ціха ў полі шумела калоссе,
Адгукалася рэха ў прасторы.
Мо тады каму-небудзь здалося,
Што у шуме тым чуюцца зоры.

Ды з-пад зорак даносяцца словы
Пра касмічныя карты ў планшэтах,
Пра палёт у бязважкасці новы,
Пра сляды на далёкіх планетах...

Так легенда зрабілася быллю.
Нашы сокалы горда ўзлятаюць.
Зор высокіх кранаецца крылле —
Зоры ў небе спяваюць.

*25.VIII 1962 г.*



## НЯБЕСНЫМ БРАТАМ

Шумяць у полі каласы,
Ідзе над краем лета.
Братоў нябесных галасы
Пранесліся над светам:

«Усім народам наш прывет
З-пад сонца пасылаем.
Ідзём па курсу. Усё як след.
Паповіч,
Нікалаеў».

Я слухаў з космасу братоў,
Размовы іх жывыя.
Мне прыгадаліся ізноў
Паходы франтавыя.

Ішлі ў разведку па лясах
Мае салдаты летам.
Як палітрук я на грудзях
Хаваў іх партбілеты.

Праз фронт да роднае зямлі
Іх нёсся голас чысты.
У той разведцы ўсе былі
Салдаты-камуністы.

Цяпер ідуць капаць руду
Разведчыкі былыя.
Разведку ў космасе вядуць
Малодшыя браты іх.

Ляціць адзін, а з ім — другі,
Ўсяму каб ведаць свету,
Якія там, між зор, шляхі
На іншыя планеты.

Там, у завоблачнай цішы,
Пранёсся іхні вырай.
Адтуль, з асвоеных вышынь,
Мы чулі голас шчыры.

Нам гэтак радасна пачуць
Хвілінай урачыстай,
Што ў космас першымі ідуць
Салдаты-камуністы.



Такі рубеж змаглі узяць!
Цяпер нат вораг верыць,
Што нашы хутка паляцяць
На Месяц і Венеру.

*18.VIII 1962 г.*

## ВЯРТАННЕ ПАЭТА

Не, не слязою, што з гора упала,—
Радасцю свеціцца твар светларусы.
Сына вялікага — Янку Купалу
Зноў сустракае зямля Беларусі.

Вось каля новага, светлага дому,
Тут, дзе ён жыў з намі многія годы,
Выйшлі спаткаць мы яго,
Як жывому,
Кветкі падносім з палёў нашых родных.

Цесным натоўпам яго акружаем,
Быццам вярнуўся паэт з падарожжа,
Шчырай прамовы ці верша чакаем,
Што зноў нашы сэрцы ўстрывожаць.

А ён павітаўся з усімі:
«Прабачце,
Доўгай не ўмею казаць я прамовы.
Хочацца сёння самому пабачыць,
Як беларусы страчаюць дзень новы.



Сам пагляджу я, як раніцай звонкай
Горад плыве мой, з руінаў узняты.
Ніколі не бачыў сваю я старонку
Такою шчаслівай, такою багатай.

Зямля мая, кажуць, шахцёрскаю стала,
Морам усланы лугі, як абрусам...»
І вышай на камень узняўся Купала,
Каб вечна ўглядацца ў прастор Беларусі.

*5.VII 1962 г.*

## Я ТВОЙ СЫН

Я твой, партыя, сын,
Усім сэрцам з табою.
Твой салдат радавы я з той самай пары,
Як заняў свой рубеж і прасіў перад боем,
Каб мяне камуністам лічылі сябры.

Ты жыццё мне дала, ашчаслівіла лёс мой,
Радасць, шчасце і мір ты прынесла ў мой дом.
Маладыя мае, непаўторныя вёсны
Азарыла сваім неўміручым святлом.

Ласкай матчынай ты нас усіх атуліла,
Разам з намі і ў горы, і ў шчасці была.
Калі трэба было — ты мяне пажурыла,
Заслужыў — ты мне ордэн на грудзі дала.

Кожнай кропляй крыві
Мне заўсёды з табой быць,
І я вельмі шчаслівы, я рады душой,
Што жыццёвы мой лёс не адною асобай
Вызначаецца — ўсёю тваёю сям'ёй.



За сардэчнасць тваю,
За твой клопат, парады,
За падтрымку, давер у святой барацьбе,
За ўсё тое, за ўсё, чым душа мая рада,—
Я прыношу сыноўнюю вернасць
Табе!

*1961 г.*

## МАЕ НАСТАЎНІКІ

Я зноўку роднай вёсцы адгукнуўся.
Там школа ёсць.
Мне не забыць яе.
Адтуль у шлях па роднай Беларусі
Вялі мяне настаўнікі мае.

Ужо сівым стаў фізік барадаты,
Які на ўроках гаварыў не раз:
— Надыдзе час — расшчэпяць людзі атам,
Што стане новай эраю для нас.

Са шчырых слоў географа мы зналі,
Які багаты наш савецкі край.
І ўжо тады, у школе, уяўлялі,
Як наша моладзь едзе на Алтай.

А як не ўспомніць цёплым, добрым словам
Выкладчыка старога роднай мовы?
З якой любоўю
                    і з якім запалам
Знаёміў нас ён з вершамі Купалы!



Важаты наш!
Было нам год па дзесяць,
А ён не болей як семнаццаць меў.
Але ніколі не забыць тых песень,
Якія нам ён у атрадзе пеў.

Без гэтых песень,
Шчырых і пявучых,
Без роднай мовы
Я не змог бы жыць.
На ёй шумелі мне з дзяцінства пушчы,
На ёй вучылі родны край любіць.

З маленства вершы я чытаў на памяць,
Яны ўвайшлі ў душу маю навек.
Я з імі йшоў нялёгкімі шляхамі
Праз дым,
          агонь,
                    віры халодных рэк.

Шмат іншых школ не папракнём ні ў чым мы,
Яны шырэй нам расчынілі свет.
Ды, як раней, стаяць перад вачыма
Географ, фізік, хімік, мовавед...

Прыгадваючы сёння дні былыя,
Хачу я стаць настаўнікам-байцом,
Каб нашы песні, вершы агнявыя
Вучылі, клікалі, вялі ў жыццё!

*1961 г.*

## ПЕСНЯ ПРА МУЖНАСЦЬ

Наўкол у лясной завірусе
Лісты свае восень кладзе.
Па дымных шляхах Беларусі
Харужая Вера ідзе.

Трывожна гудуць
                    над Дзвіною
Бары маладыя наўсцяж.
Далёка ў калысцы малое
Чакае матулю дзіця.

Ды толькі матуля не можа
З-за фронту вярнуцца дамоў.
Ёй трэба прайсці бездарожжам
Праз ночы,
                    заслоны франтоў.

Каб радасна кожная маці
Магла сваіх дзетак сустрэць,
Яна за народнае шчасце
Ідзе на жыццё і на смерць.

Гучаць ёй дзявочыя вёсны
Здалёк варшавянкай сваёй,
Махаюць з-пад Нёмана сосны
Вяршынямі стромкімі ёй.

А сёння вясёлыя ружы
Квітнеюць на вольнай зямлі.
Імя нашай Веры Харужай
Мы ў песню бяссмерця ўплялі.

*1961 г.*

## РЭХА

*Алесю Звонаку*

Над зямлёй плывуць аблокі цугам.
Да світання шмат яшчэ гадзін.
І, згубіўшы у дарозе друга,
Чалавек праз лес ідзе адзін.

Клікне раз, другі — не адзавецца.
Толькі дрэвы голас падаюць.
Сосны, як салдаты на паверцы,
Пераклічку між сабой вядуць.

Чалавек надзеі не губляе:
Будзе час — яго спаткае друг.
А ў нябёсах месяц ярка ззяе,
Чыстым срэбрам умывае луг.

Прыгадаў, як хлопчыкам аднойчы
Маці зваў, блудзіў пад ззяннем зор.
Першы раз яму у цемры ночы
Адгукнуўся рэхам родны бор.

Мо тады ў свой першы ранак весні
Ён паэтам па прызванню стаў.
Першую падслухаў рыфму ў лесе,
Калі нават вершаў не чытаў.

...Ноч прайшла. Плывуць туманы лугам.
У вадзе застылі трыснягі.
Чалавек, пачуўшы голас друга,
Выйшаў сцежкаю з глухой тайгі.

Лес гамоніць людзям не на ўцеху.
Хай шумяць зялёныя бары,
Каб і ў шчасці, і ў бядзе, як рэха,
Адгукаліся на кліч сябры.

*1962 г.*

## ШЛЯХ НА СВЕТЛАГОРСК

Мне аднойчы ісці давялося
Па зямлі гэтай шляхам салдацкім.
Дажджавая, свінцовая восень
Асыпала замшэлыя хаткі.

У пасёлку жанчына старая
Сырадоем мяне частавала.
— А што там за пасёлак? — пытаю.
— То Шацілкі, сынок,— адказала.

Сёння зноў я іду гэтым шляхам.
Бор шумлівы карой залаціцца.
Сосны стромкія з песнямі птахаў
Не дадуць ужо мне заблудзіцца.

Як прыемна прайсці мне вёрст восем,
Нават іншым дарогу паказваць.
Але бачу — указкі між вёсак,
І не тыя зусім на іх назвы.

Я далей ціха крочу. Наўкола
Правады над лясною далінай.

Трубы ўсюды дымяцца над полем.
Можа, трапіў не ў тыя мясціны?

Можа, спрытнасць згубіў баявую,
Ці, быць можа, мне здрадзіла памяць?
Паглядаю на карту старую
І на шлях...
Так, здаецца, той самы.

— Як прайсці на Шацілкі? — пытаю
У хлапца, што спыніўся на ўзгорку.
— На Шацілкі?
Такіх мы не знаем.
— А як горад завуць?
— Светлагорскам!

*28.VIII 1962 г.*

## ПАД НЕБАМ БЛАКІТНЫМ

Мая Беларусь —
Край Дняпра і Палесся,
Празрыстых азёраў, крыніц.
Край шчырай, сардэчнай купалаўскай песні
І пільных пастоў ля граніц.

Край новых заводаў, сівой Белавежы
Са сцежкамі дужых зуброў.
Як Нёман — магутны, як Нарач — бязмежны,
І вольны, як подых вятроў.

Ад хат саламяных да светлых палацаў
Расла ты у працы, ў баях,
Краіна майго залатога юнацтва,
Любімая маці мая!

Люблю твой прастор,
Птушак спеў на світанні,
Калінавы жар у гаях.
Ты — радасць і сум маіх першых спатканняў,
Ты — першая песня мая.

У братняй сям'і ты мяне узрасціла
І мой ашчасlівіла лёс.
Героям дала ты гастэлавы крылы,
Вачам іх — блакіты нябёс.

*1961 г.*

## ДЗЯДЗЬКА МАРТЫН

Гаворка ішла па калгасу
Пра дзядзьку Мартына:
— Касец ён у нас першакласны
І дужы мужчына.

Так, ён пакасіў за год сорак
Траў розных нямала.
Аднойчы ж вялікае гора
Яго напаткала.

Агонь засланяў краявіды.
Дрыжала зямля ўся.
Мартын без рукі, інвалідам
На ўвесь век застаўся.

Яму спачувалі, вядома,
І кідалі словы:
— Што ж, дзядзька, сядзі сабе дома,
Насі жонцы дровы.

Было гэта крыўдна Мартыну,
Раней жа, на працы,

З касою ніводзін мужчына
Не мог з ім зраўняцца.

Цяпер вартавым ля касілак
Яго прызначалі,
У школу званіць перапынак
Яго пасылалі.

Ды ўбачылі — не задаволен
Мартын той работай.
Туды, дзе ўсе людзі,— у поле
Ісці зноў ахвота.

Зайздросна глядзеў, як касілі
Сябры сенажаці,
Ды неяк яго папрасілі
Ў стагі сена класці.

Ты б толькі пабачыў, таварыш,
Як тут, над лугамі,
Працуе Мартын. Быццам марыў
Спрачацца з вятрамі.

Адною рукою за двух ён
Зрабіць паспявае,



Ды так, што стагі завіруха
Не зваліць любая.

Ніхто лепш Мартына на свеце
Не змог скласці стога.
Тут самі і сонца і вецер
Яму дапамога.

Як вежа, вятроў не баіцца
Стог кожны ў даліне.
Каму б нікаму павучыцца
У дзядзькі Мартына.

*25.VIII 1962 г.*

## ДВА САЛЮТЫ

Як вярнуўся з паходу ты з кайстрай
салдацкай,
Сустракаў на дарогах цябе твой народ.
І, магчыма, ў той дзень на шляху каля Гжацка
Заўважаў цябе хлопчык дванаццаці год.

Разам з бацькам стаяў і глядзеў на дарогу,
Каб паднесці табе майскіх кветак букет.
І пачуў у той дзень ён салют Перамогі,
Што ў Маскве прагучаў,
скалыхнуў увесь свет.

Кожны рад быў такому салюту, вядома,
Зноў хацелася многае штосьці зрабіць.
І, напэўна, прыснілася ноччу малому,
Як у неба да самых ён зорак ляціць.

Адшумелі, як хвалі, юнацкія вёсны.
Сёння хлопец той гжацкі — вядомы маёр.
І не ў марах ужо, і не ў сне ён дзівосным —
Самым першым узняўся да сонца і зор.



Можа, ты разам з сынам стаяў ля дарогі,
Нёс на Красную плошчу герою букет,
Чуў, як сёння у гонар яго Перамогі
Абвяшчала сталіца
Салют на ўвесь свет!

*1961 г.*

## МАТЧЫНА ВЕРА

Калі ў лесе зязюля кувала,
Маці сына дадому чакала.

Маці сына чакала з дарогі
Раннім летам пасля перамогі.

А вярнулася войска дадому,
Ў хату воін зайшоў незнаёмы.

Зведаў гора, напэўна, багата:
Срэбра ўсыпала скроні салдата.

Маці воіна спаць палажыла,
Ноччу ціха кашулю памыла.

Як устаў, правяла за вароты:
— Можа, бачыў сыночка майго ты?

Што сказаць адзінокай жанчыне?
— Бачыў, маці.



— А дзе ж?
— У Берліне.

...Не вярнуўся з вайны сын дадому.
Дзе загінуў — дасюль не вядома.

Толькі маці не верыць не можа,
Ўсё глядзіць на вайскоўцаў прахожых.

Ўсё сыночка свайго выглядае,—
Мо вярнуўся з далёкага краю.

*1961 г.*

## САЛДАЦКАЯ ФОРМА

Я, мой дружа, сёння падпалкоўнік.
Многа розных пройдзена шляхоў.
Але ўсё жыццё я мушу помніць
Дзень,
Калі на службу ў полк прыйшоў.

На маёй пілотцы зорка ззяла,
Аганьком свяціла залатым.
Першы раз убачыў генерала,
Калі мы ў атаку йшлі за ім.

З той хвіліны —
Я салдат Айчыны.
Сотні вёрст пратупаў пехатой.
На спатканне з любаю дзяўчынай
Я з'яўляўся ў форме баявой.

Як ішлі на Захад нашы войскі,
Не адну нагамі змераў даль.
І ў баі сам маршал Ракасоўскі
К гімнасцёрцы прышпіліў медаль.

Парудзела тая гімнасцёрка.
Раз'ядалі соль яе і пот,
А ў кішэні — жмені дзве махоркі
Ды з салдацкай лірыкай блакнот.

Песня нас вяла да перамогі,
Да сустрэч, да радасці жыцця.
Пылам адкурыліся дарогі,
Леглі зоркі на пагон байца.

*1961 г.*

# ЯСНЫЯ ДАЛІ

## ЯСНЫЯ ДАЛІ

Праект Праграмы партыі чытаю,
І на душы ад слоў яе святлей.
Яшчэ ясней цяпер сабе ўяўляю
Сваё жыццё, жыццё усіх людзей.

За вокнамі — празрыстасць росных кропель.
Ўстае над краем новы светлы дзень.
Ужо не здань блукае па Еўропе —
Зарой па свеце камунізм ідзе.

Пераступіў ён шмат старых парогаў,
Праменным сонцам азарыў наш век.
І маякі заззялі на дарогах,
Дзе творыць цуды просты чалавек.

У сэрцы радасць — за свой край любімы,
За свой народ, за ўсё, што робіць ён,
За тое, дружа, што твая Радзіма
Не йшла ні к кому з шапкай на паклон.

Яна з тых дзён,
Як грымнуў залп «Аўроры»,
Свой услаўляе ў будучыню шлях.
Ні перад кім — ні ў радасці, ні ў горы —
Не апускала свой савецкі сцяг.

Пад гэтым сцягам мы ішлі на бітвы
І уздымалі гарады з руін.
А сёння новы гарызонт раскрыты
Для нас з табою і для ўсіх краін.

Нам партыя ўрачыста заяўляе,
Што будзем мы пры камунізме жыць.
А будучыня ўсіх к сабе чакае,
Хто сёння можа для яе тварыць.

*1961 г.*



## МАЙМУ СУЧАСНІКУ

Сучаснік мой!
Хто б ты ні быў сягоння —
Каваль, рабочы, воін ці паэт,—
Ты — творца шчасця, ты — адзін з мільёнаў,
Якія новы збудавалі свет.

Што б ні зрабіў ты — цаліну асвоіў
Ці новы провад нафтавы праклаў,—
Ты жыў вялікай мэтаю людскою,
Якую з'езд партыйны вызначаў.

У кожным кроку, ў кожнай справе новай
Радзіма чула мужны поступ твой.
Сябры к твайму прыслухваліся слову,
А ворагі дрыжалі прад табой.

Ты быў заўсёды на пярэднім краі,
Байцом за мір у працы, барацьбе.
Раскажа час
Пра ўсё, аб чым ты дбаеш,
Пра ўсё, чым жыў, што вабіла цябе.

Назваць цябе
Унукі будуць рады,
Бо ты для іх усё, што мог, зрабіў,—
У строй камуністычнае брыгады
На іх дарогу
Першым ты ступіў.

*1960 г.*

## ВЯЛІКІ ПАЧАТАК

Не, я не быў, як Зімні бралі
Бацькі, пачаўшы свой паход,
Але я знаю — пачыналі
Яны касмічны наш палёт.

Яны ішлі на подзвіг ратны,
Няслі крывёй абмыты сцяг.
То быў Кастрычніка пачатак,
Пачатак новага жыцця.

Цяпер, калі ў прастор сузорны
Ўзлятаюць нашы караблі,
Здаецца мне — то залп «Аўроры»
Праходзіць рэхам па зямлі.

*1962 г.*

## ХАТА Ў СМОЛЬНІ

Пад сасновым гоманам
Лёг прастор наўкольны.
На ўзбярэжжы Нёмана
Хутар з назвай Смольня.

Льецца срэбра месяца
На лугі, паляны.
І агеньчык свеціцца
Ў доміку драўляным.

Будзеш крочыць, можа,
Пад густою шатай —
Не міні, прахожы,
Той маленькай хаты.

Дзе калоссе спелае
Сонца днём купала,
Ўпершыню сустрэліся
Колас і Купала.

Пад альшынай з хмелем
Зацвіталі кветкі,



А наўкол шумелі
Панскія палеткі.

Поле, луг і ранак
З салаўямі ў лесе —
Ўсё было у пана,
А ў іх — толькі песні.

Вечна маладыя
Тыя думы-песні
Прывялі сюды іх,
У пакойчык цесны.

Гаспадар у хаце
К госцю з хлебам-соллю:
— Ну, расказвай, браце,
Як дайшоў да Смольні.

І праз доўгі вечар
Паплылі ўспаміны,
Як шукалі стрэчы
Змрочнаю часінай,

Як вялі гасцінцы
У жыццё іх ранкам,—

Кастуся з Акінчыц,
І з-пад Мінска — Янку.

Па ўсяму ўжо краю
Вершы іх хадзілі.
А яны за чаем
Ноч прагаманілі.

Перад самым золкам
Хатка апусцела.
Дзесь жалейка звонка
Ў лузе празвінела.

Гаспадар кагосьці
Клікнуў за парогам
І праводзіў госця
Ў дальнюю дарогу...

Будзеш крочыць, можа,
Пад густою шатай —
Не міні, прахожы,
Гэтай роднай хаты.

*22. VIII 1962 г.*

## ДОБРЫ ЗВЫЧАЙ

Бушавала стыхія марская,
Адганяючы ветразь удаль.
Мора сінь! Ні канца ёй, ні краю.
Толькі барады белыя хваль.

Бура! Стомлены людзі ў змаганні.
Ўсё...
І — раптам дымок над вадой.
Звычай ёсць:
Гіне хтось ў акіяне —
Выратоўвай, хоць ён і не свой.

Маракі, што плылі на дасвецці,
Незнаёмым руку падалі.
О, каб людзі усе на планеце,
Ўсюды звычаем гэтым жылі!

*1960 г.*

## ТЫ ЧУЕШ, СВЕТ?

Раняюць паркі лісце на алеі,
Гамоняць пушчы ў восеньскай красе.
А ў зале Генеральнай Асамблеі
Прыціхлі раптам дэлегаты ўсе.

Наш дэлегат па зале велізарнай
К трыбуне йдзе,
нібы к перадавой.
Яму вітанне з боку шле Сукарна,
Фідэль з другога памахаў рукой.

І вось гучыць на ўсю планету слова,
Як медны звон, як шум ракі ў цішы.
Яго на кожнай разумеюць мове,
Бо гэта слова ад усёй душы.

Гаворыць шматмільённая краіна
Аб міры, праўдзе, шчасці ўсіх людзей.
З хлуснёй варожай,
Каб яе адкінуць,
Святую бойку чалавек вядзе.



Так па вайне наносім свой удар мы.
Ты чуеш, свет?
Мы кліч свой падаём,
Каб на планеце кожную казарму
Ператварыць у мірны, ўтульны дом.

*1960 г.*

## ШЛЯХ «САНТА-МАРЫІ»

На Захадзе сотні радыёстанцый
Трашчаць днём і ноччу наперабой,
Што «Санта-Марыя»
пад сцягам паўстанцаў
Ад роднай зямлі уцякае сваёй.

А мора яе,
як калыску, гушкае,
Грудзьмі прыкрывае, пачуўшы бяду.
І дзесьці грыміць вадаспад, што са скалаў
Развесіў казліную ўніз бараду.

Ад солі збялелі аж хвалі марскія,
Заплёскваюць шэрыя хмары ўдалі...
Чаму ж гэта следам за «Санта-Марыяй»
Чужыя ў пагоню пайшлі караблі?

Чаго яны шныраць вакол, як піраты?
Што маюць яны да той жменькі людзей,
Якія пакінулі родныя хаты,
Старэнькіх бацькоў і маленькіх дзяцей.



Я знаю, вядзе іх у шлях не стыхія.
Зямлю сваю сэрцамі любяць яны:
Дык слухай далёкая «Санта-Марыя»!
З савецкай зямлі я даю пазыўны.

Тваім пасажырам — жанчынам і дзецям,
Твайму капітану, матросам тваім:
Адзін самы верны ёсць курс ва ўсім свеце,
То курс да свабоды.
Ідзіце па ім!

*1961 г.*

## РАНІЦА КУБЫ

Над краінай занялося ранне,
І, пачаўшы дзень працоўны свой,
Вуліцай праходзіць па Гаване
Чалавек у форме баявой.

Рэвалюцыі байца і друга
Ўсе кубінцы пазнаюць у ім.
Сам вясне праклаў ён сцежкі плугам
І зямлю сялянам даў усім.

Ён —
змагар,
салдат чарнабароды,
Першым кінуў да свабоды кліч.
У цяжкія, горныя паходы
З ім сябры адважныя ішлі.

Ўспамінаюць сёння, як, бывала,
У гарах распальвалі агонь
І з Фідэлем Кастра на прывалах
З кацялка там елі аднаго.



Не адзін паход той на вяку быў
За жыццё, за шчасце на зямлі.
І над смелай, мужнай, гордай Кубай
Ранак промні ясныя разліў.

Засвяцілі людзям шчасце зоры.
А калі прыйдуць бандыты зноў,—
Там заслоняць сходжаныя горы
Скал грудзямі мужных змагароў.

І усе, каму з салдацкай кайстрай
Давядзецца стаць у строй палка,
Будуць слухаць кліч Фідэля Кастра —
Ў гімнасцёрцы простай дружбака.

*1961 г.*

## КРОЎ ЛУМУМБЫ

Ад цяжкай работы да поту аж зморан
Той вецер, што ў полі хістае трыснёг.
А ў небе высокім, бы парус у моры,
Такі ж, як і ў нас, плыве месяца рог.

Далёкая Афрыка!
Край мужны — Конга!
Ніколі, ніколі я там не бываў.
Ні з родных, ні з блізкіх няма там нікога.
Чаму ж гэты край родным,
блізкім мне стаў?

Любоўю братэрскаю поўніцца сэрца
Да іх — незнаёмых, далёкіх сяброў,
І кліча туды, дзе крыніцаю б'ецца
Патрыса Лумумбы гарачая кроў.

На сцягах паходных яна палымнее
Надзеяй на шчасце, святлом новых дзён.
Вышэй узнімі голас свой, Асамблея!
Навекі, навекі забойцам праклён!



Зямля прыняла кроў Лумумбы святую,
Каб людзям крыві больш на свеце не ліць.
Далёкая Афрыка!
Голас твой чуем.
Таго не забіць,
Хто нараджан, каб жыць!

*1962 г.*

**ЗМЕСТ**


Калі я нарадзіўся... . . . . . . . . . . 5

**Вішнёвы агонь**

Вішнёвы агонь *(паэма)* . . . . . . . 9
Мо хто-небудзь мяне папракае... . . . . 39
Арэшына . . . . . . . . . . . . . 40
Чарэмха ў садзе адцвітала... . . . . . . 42
Сяброўскае слова . . . . . . . . . . 44
Балада пра невядомага . . . . . . . 45
Бацькі і дзеці . . . . . . . . . . . 48
Ластаўка . . . . . . . . . . . . . 50
Не спіцца начамі... . . . . . . . . 52
Сапраўдны друг . . . . . . . . . . 55
Калі садзяць сады... . . . . . . . . 56

**Зоры спяваюць**

Зоры спяваюць . . . . . . . . . . . 61
Нябесным братам . . . . . . . . . 63
Вяртанне паэта . . . . . . . . . . . 66





Я твой сын . . . . . . . . . . . . 68
Мае настаўнікі . . . . . . . . . . . 70
Песня пра мужнасць . . . . . . . . 73
Рэха . . . . . . . . . . . . . . . . 75
Шлях на Светлагорск . . . . . . . . 77
Пад небам блакітным . . . . . . . . 79
Дзядзька Мартын . . . . . . . . . . 81
Два салюты . . . . . . . . . . . . 84
Матчына вера . . . . . . . . . . . 86
Салдацкая форма . . . . . . . . . . 88

**Ясныя далі**

Ясныя далі . . . . . . . . . . . . . 93
Майму сучасніку . . . . . . . . . . 95
Вялікі пачатак . . . . . . . . . . . 97
Хата ў Смольні . . . . . . . . . . 98
Добры звычай . . . . . . . . . . . 101
Ты чуеш, свет? . . . . . . . . . . 102
Шлях «Санта-Марыі» . . . . . . . . 104
Раніца Кубы . . . . . . . . . . . . 106
Кроў Лумумбы . . . . . . . . . . . 108

**Прыходзька Пятро**
Вішнёвы агонь. Вершы і паэма.
Мінск, Дзяржвыд БССР, 1963

Бел 2

На белорусском языке

**Петр Федорович Приходька**
ВИШНЕВЫЙ ОГОНЬ

Государственное издательство БССР
Минск 1963

ҚНІГА ВЫДАДЗЕНА ПА АРЫГІНАЛУ-МАҚЕТУ

Рэдактар **Хв. Жычка**
Мастак **Г. Қлікушын**
Мастацкі рэдактар **Л. Прагін**
Тэхнічны рэдактар **В. Варэнікава**
Қарэктар камбіната **Н. Нісневіч**

АТ 01454. Здадзена ў набор і друк 16/III 1963 г. Тыраж 3000 экз. Фармат 84×108 1/64. Фіз. друк. арк. 1,75. Ум. друк. арк. 2,86. Уч.-выд. арк. 2,27. Зак. 1831. Цана 13 кап.

Паліграфічны камбінат імя Я. Қоласа
Галоўвыдата Міністэрства культуры БССР,
Мінск, Чырвоная, 23.